**Д. А. ДОЎГАЛЬ,**
старшы выкладчык Магілёўскага дзяржаўнага
універсітэта імя А. А. Куляшова

# Займальны матэрыял па тэме «БЕЛАРУСКІ КАЛЯНДАР»

## (V—VI класы)

Каляндар мае важнае адукацыйна-выхаваўчае значэнне. Рэгулярная праца з ім не толькі дае магчымасць звярнуць увагу на пэўныя звесткі аб прыродзе і беларускай культуры, але і стымулюе пазнавальную дзейнасць школьніка. Каляндар (асабліва народны) валодае вялікім выхаваўчым патэнцыялам, бо ў ім адлюстраваны выпрацаваныя стагоддзямі маральна-этычныя нормы, паводле якіх жылі нашы продкі. Каляндар служыць сродкам актывізацыі міжпрадметных сувязей у школе, ён патрэбны на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці, без яго не абысціся настаўніку-філолагу пры вывучэнні гаваркіх слоў і пры знаёмстве з лічэбнікамі, у працы з малымі фальклорнымі жанрамі і пры даследаванні народнай абрадавай паэзіі, падрыхтоўцы да тэсціравання і алімпіяды, на занятках па развіцці маўлення на ўроках мовы і літаратуры.

Прыведзеныя заданні паспрыяюць таму, каб знаёмства з календаром на ўроках беларускай мовы стала не толькі карысным, але і займальным.

## Заданні

1. Пазнаёмцеся са скорагаворкамі, якія склаў пісьменнік Васіль Жуковіч.

| | |
|---|---|
| **Красавік**<br>Зяе красавік расой,<br>сонцам, краскамі, красой. | **Ліпень**<br>Лета, ліпень.<br>Лінуў лівень.<br>Пахнуць ліпы<br>і маліны. |
| **Верасень**<br>Вырас верас і цвіце.<br>Восень, верасень ідзе. | **Снежань**<br>У снежні сняжынкі<br>замялі сцяжынкі. |

Паспрабуйце самі прыдумаць скорагаворкі па назвах гэтых і іншых месяцаў.

2. Знайдзіце назвы месяцаў, якія «схаваны» ў гэтай табліцы.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| К | І | В | Ч | П | Е | Л | Ю | Т | Ы |
| Е | Л | А | Э | Л | І | В | Е | Р | А |
| С | А | К | Р | О | П | Е | Н | Ь | С |
| К | Т | А | В | М | С | Е | Ь | Н | Е |
| Л | І | С | Е | А | Т | Р | Ь | Н | Е |
| П | А | Т | Н | Й | У | Ь | Н | А | Ж |
| А | Д | Г | Ь | О | Д | З | Е | Р | Е |
| К | Р | А | С | А | В | І | К | І | Н |
| С | Т | Р | Ы | Ч | Н | І | К | Ы | С |
| А | К | Ь | Н | Е | В | І | Н | Ж | А |

3. Як вядома, перыфраза — гэта выраз, які з'яўляецца апісальнай назвай прадмета. Паспрабуйце замяніць перыфразамі назвы беларускіх месяцаў ці дзён тыдня. Напрыклад, *студзень — каляндарны першынец, люты — мезены палец года* (бо кароткі), *нядзеля — царыца тыдня* і г. д.

4. Самастойна прыдумайце назвы месяцаў. растлумачце іх. Пасля гэтыя словы (*снегатай, школьнік, нараджэннік, канікулярнік, дажджавік* і г. д.) можна выкарыстаць для марфемнага і словаўтваральнага аналізу.

5. Колькі простых прыметнікаў вы зможаце ўтварыць ад назваў чатырох пор года — лета, восені, зімы і вясны?

6. Ад назваў месяцаў утварыце прыметнікі. Складзіце з гэтымі прыметнікамі па два словазлучэнні, каб яны выступалі ў прамым значэнні і ў якасці эпітэтаў. Праз сінонім раскрыйце сэнс эпітэта. Напрыклад:

| Прыметнік у прамым значэнні | Прыметнік-эпітэт | Сінонім |
|---|---|---|
| Студзеньскія канікулы | Студзеньская ўсмешка | Няшчырая |
| Чэрвеньскія святы | Чэрвеньская паходка | Свабодная |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

7. Запоўніце табліцу найважнейшых народна-рэлігійных свят*.

| Свята | Калі адзначаецца | Чаму прысвечана | Як святкуюць |
|---|---|---|---|
| Каляды | | | |
| | Рухомае свята (ад 4 красавіка па 8 мая) | | |
| | | У гонар летняга сонцазвароту | |
| | | | Наводзяць парадак; мыюцца ў лазні; гатуюць стравы (іх колькасць павінна быць няцотнай) і ладзяць абрадавую вячэру, якая пачынаецца з малітвы; успамінаюць добрым словам памерлых родзічаў; стол пакідаюць непрыбраным, рэшткі страў назаўтра аддаюць свойскім жывёлам і птушкам |

8. Напішыце сачыненне-апавяданне, а для гэтага выканайце наступныя ўмовы.

1) Закончыце прапанаваныя тэксты.

**Красавік**

Ці ведаеце вы, чаму ў Красавіку так хораша і столькі красак?

Ды таму, што Красавік — мастак.

Быў час, калі Красавік першы раз прыйшоў на зямлю. Не спадабаліся яму пажоўклая пасля зімы трава, шэрае неба, чорная зямля... І вырашыў ён... (*Клаўдзія Каліна*).

**Люты**

Ідзе па зямлі Люты і пытае ў кожнага, ці добра адзеты і абуты.

Зайшоў у сяло, пастукаўся да дзеда з бабай... (*Клаўдзія Каліна*).

2) Прыдумайце пачатак прапанаванай гісторыі.

**Ліпень**

...І да гэтага часу пчолы дзякуюць шчодраму Ліпеню.

— Дз-дзя-куй! Дз-дзякуй! — дзынкаюць яны пад ліпамі.

Пастойце хвілінку ў ліпені пад расквечанымі ліпамі, прыслухайцеся, самі пачуеце (*Клаўдзія Каліна*).

3) Выберыце адну з прапанаваных тэм сачынення:

**«Як восень дрэвы ашукала»** (назва верша Рыгора Барадуліна);

**«Восень шыла сарафан»** (назва апавядання Міхася Даніленкі)**.

9. Пералічыце назвы знакаў задыяка па-беларуску. Калі вы нарадзіліся і хто вы па знаку задыяка? Што вы ведаеце пра свой знак задыяка? Прыдумайце жартаўлівы гараскоп для людзей свайго знака задыяка на тыдзень.

10. Вызначце, назвы якіх месяцаў прапушчаны ў пададзеных прыкметах (назва кожнага месяца можа выкарыстоўвацца адзін раз).

1) У ________________ гола ў садзе.

2) ________________сушыць, нічога з зямлі не рушыць.

3) ________________зямлю студзіць.

4) ________________ наробіць плюты.

5) ______________ часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.

6) ________________ зямлю грудзіць, хаты студзіць.

7) ______________ — жывёлу ў поле пхай.

8) ________________ пякучы, але даручы.

9) ________________ не гуляе — ураджай люляе.

10) ________________ ні калёс, ні палоз не любіць.

11) Кожная хата ў ________________багата.

12) Як настаў ________________ , дык туман кожны дзень.

---

* Заданне можна відазмяніць, замест народных свят разгледзець дзяржаўныя ці папрасіць вучняў самім прыдумаць якое-небудзь свята і расказаць пра тое, як яно можа адзначацца.

** Прапанаваныя творы можна знайсці ў выд.: Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. Ф. Шаўлоўская. — Мінск : ТАА «Юніпрэс», 2003.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Адказы

2. Назвы асенніх месяцаў выдзелены тлустым шрыфтам, зімовых — *курсівам*, вясенніх — падкрэслены, летніх — заштрыхаваны.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| К | І | В | Ч | П | Е | *Л* | *Ю* | *Т* | *Ы* |
| Е | Л | А | Э | Л | І | В | Е | Р | А |
| С | А | К | Р | О | П | Е | Н | Ь | С |
| К | Т | А | В | М | *С* | Е | Ь | Н | Е |
| Л | І | С | Е | А | *Т* | Р | *Ь* | *Н* | *Е* |
| П | А | Т | Н | Й | *У* | *Ь* | *Н* | *А* | *Ж* |
| А | Д | Г | Ь | О | *Д* | *З* | *Е* | Р | *Е* |
| К | Р | А | С | А | В | І | К | І | *Н* |
| С | Т | Р | Ы | Ч | Н | І | К | Ы | *С* |
| А | К | Ь | Н | Е | В | І | Н | Ж | А |

5. Летні; асенні, восеньскі; зімні, зімовы; вясенні, веснавы, вясновы, вясняны, весні.

7.

| Свята | Калі адзначаецца | Чаму прысвечана | Як святкуюць |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 3 |
| *Каляды* | 7 студзеня (увогуле зімовыя святкі пачынаюцца пасля поснай куцці (6 студзеня) і заканчваюцца на Вадохрышча (19 студзеня)) | Святкаванне ў гонар зімовага сонцастаяння і Нараджэння Збавіцеля | За святочнай вячэрай збіраецца ўся сям'я; калякднікі ходзяць па хатах, водзяць «казу», носяць «зорку», славяць песнямі гаспадароў і за гэта атрымліваюць пачастунак; дзяўчаты варожаць |
| Вялікдзень | *Рухомае свята (ад 4 красавіка па 8 мая)* | Уваскрашэнне Хрыста (даўней свята было звязана з вясеннім раўнадзенствам) | Разгаўляюцца пасля сямітыднёвага посту; фарбуюць яйкі, пякуць нірагі, рыхтуюць «пасху», якую асвячаюць у царкве; гуляюць у біццё і качанне яек; валачобнікі абыходзяць двары сваёй ці нават суседняй вёскі, спяваючы ўрачыстыя віншавальныя песні |
| Купалле | У ноч з 6 на 7 ліпеня (з 23 на 24 чэрвеня па старым стылі) | *У гонар летняга сонцавароту* | На беразе ракі ці возера раскладваюць вогнішча; вакол вогнішча водзяць карагоды; скачуць праз вогнішча; падпальваюць прасмаленае кола на высокіх шастах або спускаючы з гары; збіраюць зёлкі, якія, лічыцца, маюць цудадзейную сілу; дзяўчаты кідаюць вянкі на ваду і варожаць па іх руху; хлопцы і дзяўчаты парамі шукаюць папараць-кветку |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| Дзяды | Субота на трэцім тыдні пасля Пакроваў (Пакровы — 14 кастрычніка) | Ушанаванне ўсіх памерлых продкаў | *Наводзяць парадак; мыюцца ў лазні; гатуюць стравы (іх колькасць павінна быць няцотнай) і ладзяць абрадавую вячэру, якая пачынаецца з малітвы; успамінаюць добрым словам памерлых родзічаў; стол пакідаюць непрыбраным, рэшткі страў назаўтра аддаюць свойскім жывёлам і птушкам* |

9.

| Знак задыяка | Дата |
|---|---|
| Авен | 21 сакавіка — 20 красавіка |
| Цялец (Цялок) | 21 красавіка — 20 мая |
| Блізняты | 21 мая — 21 чэрвеня |
| Рак | 22 чэрвеня — 22 ліпеня |
| Леў | 23 ліпеня — 22 жніўня |
| Дзева (Панна) | 23 жніўня — 22 верасня |
| Шалі | 23 верасня — 23 кастрычніка |
| Скарпіён | 24 кастрычніка — 22 лістапада |
| Стралец | 23 лістапада — 21 снежня |
| Казярог | 22 снежня — 19 студзеня |
| Вадалей (Вадаліў) | 20 студзеня — 18 лютага |
| Рыбы | 19 лютага — 20 сакавіка |

10. 1) У *лістападзе* гола ў садзе.
2) *Красавік* сушыць, нічога з зямлі не рушыць.
3) *Студзень* зямлю студзіць.
4) *Люты* наробіць плюты.
5) *Сакавік* часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.
6) *Снежань* зямлю грудзіць, хаты студзіць.
7) *Май* — жывёлу ў поле пхай.
8) *Ліпень* пякучы, але даручы.
9) *Чэрвень* не гуляе — ураджай люляе.
10) *Кастрычнік* ні калёс, ні палоз не любіць.
11) Кожная хата ў *жніўні* багата.
12) Як настаў *верасень*, дык туман кожны дзень.

**Спіс літаратуры**


Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. Ф. Шаўлоўская. — Мінск : ТАА «Юніпрэс», 2003. — 688 с.

*Ліцьвінка, В. Д.* Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. — Мінск : Беларусь, 1998. — 190 с.

*Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. — Мінск : Полымя, 2002. — 240 с.

*Раманцэвіч, В.* Пачаткі роднае мовы : дапам. для ўсіх / В. Раманцэвіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 143 с.

Родны край : адрыўны каляндар на 2006 год / рэд.-склад. В. М. Пінчук. — Мінск : Беларусь, 2005.

Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. — Мінск : БелЭн, 2002. — 784 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова